# «... ПАКРЫЙ САБОЙ НАРОДНЫ РУХ!»

(Працяг. Пачатак на 1 стар.)

Нічога дзіўнага, што нямецкія акупанты ў час другой сусветнай вайны, заплюшчыўшы вочы на свае сапраўдныя адносіны да беларускае сімволікі (пад Пагоняй немцаў перамаглі ў 1410 г. пры Грунвальдзе, а ў 1918 г. акупанты зрывалі бела-чырвона-белыя сцягі як знакі беларускае дзяржаўнасці), згадзіліся на яе выкарыстанне на тэрыторыі Беларусі. За гэтым стаяў халодны палітычны разлік: літасціва дазволіць пэўныя праявы нацыянальна-культурнага жыцця, каб выглядаць лепш за папярэдніх гаспадароў палітычнага становішча.

Лёс сімволікі ў гады акупацыі стаў галоўным аргументам афіцыяльнай прапаганды супраць яе. Але ці варта нам адмаўляцца, напрыклад, ад роднае мовы, таму што на ёй гаварылі і калабарацыяністы? Ад народных песень, бо іх зборнікі выходзілі ў акупіраваным Менску? Якія ж крытэрыі анафемы?

Складанасць пытання ў тым, што таталітарызм планамерна вытручваў гістарычную памяць народаў, і сёння не кожны, пабачыўшы Пагоню ці штандар, падумае пра грунвальдскую славу ці мужнасць паўстанцаў Каліноўскага, або зацятую барацьбу заходніх беларусаў супраць апалячвання: і проста таму, што чалавек можа нічога не ведаць пра гэтыя старонкі нашай гісторыі. Трэба ж ведаць пра ўсё, і тады дылема: што пераважыць — некалькі гадоў акупацыі ці шматвяковая гісторыя народа — вырашыцца сама па сабе.

У міжваенны перыяд нацыянальныя сімвалы сталі знакамі прыналежнасці да яе нацыянальна-культурнага і вызваленчага руху ў акупіраванай палякамі Заходняй Беларусі. Тры паласы былі на цэшках вучняў Віленскае беларускае гімназіі, на штандарах барацьбы. У беларускіх клубах і чытальнях можна было бачыць беларускі герб і сцяг. Дзе-нідзе, свята верачы ў будучы шчаслівы лёс уз'яднанага народа, з бела-чырвона-белымі сцягамі ў верасні 1939 г. сустракалі Чырвоную Армію.

Адносіны БНФ «Адраджэнне» да афіцыяльнае дзяржаўнае сімволікі ў Праграме Беларускага Народнага Фронта. Я ж дазволю сабе выказацца асабіста. Вексілолагі з Латвіі П. і М. Цюрыны слушна заўважылі: «... Ступень «патэнтнай чысціні» дзяржаўных сімвалаў адлюстроўвае і дэкларуе ўзровень самастойнасці і незалежнасці самой дзяржавы». Сцяг БССР ад пачатку ствараўся як знак мінімальнага ўзроўню ці нават адсутнасці якой бы там ні было самастойнасці гэтага ўтварэння. Яго чырвань рознілася ад чырвані іншых сцягоў адно літарамі ССРБ або БССР. Пасляваенная сітуацыя вымусіла сталінскі рэжым заняцца падфарбоўкай фасадаў «суверэнных» рэспублік у прапагандысцкіх і непасрэдна практычных мэтах — увесці паболей рэспублік у ААН дзеля лішніх галасоў. У канстытуцыі рэспублік быў фармальна вернуты пункт пра нацыянальныя вайсковыя злучэнні, а ў пачатку 50-х распачалася кампанія стварэння новых афіцыяльных сцягоў. Да чырвонага палотнішча з сярпом, молатам і пентаграмай далучалі каляровую палоску. Прычым цікава, што палоска, дараваная Грузіі,— блакітная, Латвіі — сіняя, хоць такіх колераў няма на нацыянальных сцягах гэтых народаў. Зялёнага колеру пашкадавалі для мусульманскіх народаў (толькі таджыкам далі вузенечкі пасачак), затое зеляніну ўпершыню ў сваёй гісторыі атрымалі Беларусь, Малдавія і Карэла-Фіншчына.

Новы сцяг БССР быў прыняты 25 снежня 1951 г. Яго распрацоўка, мусіць, разглядалася як заданне асаблівай сакрэтнасці, інакш чым растлумачыць, што, як сведчыць А. Міхальчанка, «Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР у 1951 годзе, калі быў аб'яўлены конкурс на новы флаг, апрача ўказа, у архівах нічога не пакінуў». Міхальчанка адшукаў імя аўтара сцяга — Гусеў М. І.: «як жывапісец ён мала вядомы». Анекдатычную няпэўнасць геральдычнага статуса новых сцягоў трапна заўважыў згаданы геральдыст К. Іваноў: «Афіцыяльныя дакументы, якія тлумачылі б сімволіку расфарбоўкі новых сцягоў, не выдадзены». Мастакі і колеразнаўцы добра ведаюць ўражанне цяжкасці, змрочнасці, якое можа пакідаць спалучэнне чырвонага і зялёнага.

Сцяг, стварэнне якога звязана з перыядам таталітарнага сталінізму, які ігнаруе нацыянальныя геральдычныя традыцыі і сведчыць пра адсутнасць суверэнітэту Беларусі,— не здабыў агульнанароднае сімпатыі і пазбаўлены гістарычнае перспектывы.

Настаў час, калі павінна спраўдзіцца прароцтва нашага нацыянальнага гімна (аўтар верша Краўцоў Макар):

Хай ажыве закамянелы
Наш беларускі вольны дух,
Штандар наш бел-чырвона-
белы,
Пакрый сабой народны рух!

**Вінцук ВЯЧОРКА,**

**Артыкул падрыхтаваны паводле матэрыялаў газеты «Грунвальд»).**




**Фестываль беларускай маладзёжнай музыкі «Басовішча-91» праходзіў у Польшчы на Беласточчыне ў мястэчку Барык. Арганізатарамі фестывалю сталі сябры Беларускага аб'яднання студэнтаў у Польшчы. За некалькі дзён да пачатку музычнага свята да месца яго правядзення пачала з'язджацца публіка. А ў пятніцу, 12 ліпеня, з Беларусі маленькімі (і не такімі ўжо маленькімі) групамі сталі дабірацца госці: музыкі, дзелавыя людзі, фанаты рок-музыкі, журналісты. Ну, і, канечне ж, гандляры.**

І вось пятніца, 12 ліпеня, вечар. Адзін з арганізатараў фестывалю Багдан Сіманенка, захоўваючы знешні спакой, знаходзіўся ў цяжкім і незайздросным становішчы: большая і да таго ж лепшая частка ўдзельнікаў фестывалю, дзякуючы доўгай стамляючай дарозе, спякотнаму сонцу і вельмі цёпламу, нават гарачаму (а дакладней «горячительному»), прыёму, мела зусім не таварны выгляд. Але, як гаворыцца, нічога ў прыродзе такога няма, каб чаго-небудзь ды не было.

«Басовішча — гэта імпрэза, падрыхтаваная Беларускім аб'яднаннем студэнтаў у Польшчы пры дапамозе людзей добрай волі, якія ўгледзелі ў ёй нагоду праявіць сябе ў розных формах нашага шматпакутнага зямнога існавання: этычнага, музычнага, нацыянальнага, эканамічнага, сацыяльнага. Няхай Бог усемагутны злітуецца над усімі імі»,— так пачаў імпрэзу канферансье фестывалю Ян Максімюк. Пад шматлікія апладысменты адкрыў свята ўжо вядомы Богдан (Бодо), апырскаўшы тых, хто сядзеў побач са сцэнай, шампанскім.

Рашуча, пакінуўшы ўсе сумненні і хваляванні ў роднай Гародні, выйшаў на сцэну Віктар Шалкевіч. Ён пачынаў канцэрт. Віктар лічыць сябе бацькам новага стылю — бруднага беларускага блюза. Аб яго фальклорна-гістарычных «пэрлах», поўных іроніі, а часцей за ўсё сарказму, не разбэшчаныя аматары аўтарскай песні змаглі атрымаць слабое ўяўленне аб тым, што такое блюз, але, спадзяюся, зразумелі, што такое БББ (брудны беларускі блюз), а тым больш паглыбілі свае веды па гісторыі нашага краю ў паслякастрычніцкі перыяд. Шалкевіч спяваў доўга, яго папрасілі на «біс», што, дарэчы, стала традыцыяй фестывалю: пасля выступлення кожны ўдзельнік выконваў яшчэ раз тую песню, якая асабліва была даспадобы слухачам.

Потым на сцэне з'явілася Лера Сом з Полацка. Тыя, хто цікавіцца беларускай бардаўскай песняй, чулі, мабыць, яе магнітафонны альбом «Мой горад». Лера спявала свае песні з гэтага альбому. Даволі нечаканым і вельмі цікавым было выступленне Юркі Асіпенкі, Адама Ляўчука і Юркі Іванюка з Беластоку — вакал і дзве гітары. Хлопцы падрыхтавалі сваю праграму за два дні да фестывалю. Разам з цёплым летнім вечарам іх выступленне стварыла прыемны лірычны настрой.

Наступнага выканаўцу, Сяржука Сокалава-Воюша, сустрэлі як народнага героя, і яго голас патануў у моры слухацкіх галасоў, якія спявалі разам з Сержуком усе песні. А выступленне бардаў у першы дзень завяршаў Зміцер Яўтуховіч з Менску, які акампаніраваў сабе на акардэоне (не зусім звычайная з'ява ў бардаўскай песні).

Рок-канцэрт распачаў беластоцкі гурт «Альбаросіка». На мой погляд, гэта было адно з самых цікавых выступленняў на фестывалі. Незвычайны тэмбр голасу вакаліста гурта Яна Хоха, сумесь рока, фальклора, рэгі і блюза, прыгожыя тэксты, не пазбаўленыя думкі. Ва ўсялякім выпадку, у нас на Беларусі падобнага яшчэ няма. Ніхто не хаваў сваіх сімпатый. Арганізатары імпрэзы да таго ж вырашылі прадэманстраваць навінкі піратэхнікі і пусцілі на сцэну дым. Праўда, агрэгат, які выконваў функцыі дымавай крыніцы, быў не апошняга пакалення, і таму аператар-піратэхнік на наступны дзень, захапіўшыся гэтым адказным заняткам, не заўважыў, як апаліў нагу бубнару «Рокіса» Анатолю Горбачу.

Гурт «Мясцовы час» з Полацка не трэба было доўга рэкламаваць. Іх шматлікія канцэрты, альбомы і плыт, які выйшаў на фірме «Мелодыя», зрабілі сваю справу. «Я жыў», «Ускраіна» і іншыя вядомыя песні гучалі са сцэны. Высокі голас вакаліста гурта Алеся Кузьміна, прафесійная праца музыкаў — і работнікі паліцыі ўжо ледзь стрымлівалі тых, хто ірваўся на сцэну. Па-праўдзе кажучы, некаторыя усё ж такі здолелі ўскарабкацца на сцэну, а потым скакалі з вышыні ў натоўп. Не думаю, што гэта рабілася ад залішніх пачуццяў, але было эфектна. Пад самы канец першага дня фестывалю выступіла віцебская «Грамада». Як сказаў адзін са слухачоў: «Грамада» ёсць тым рок-гуртам, які ў змозе дарэзаць кожную публіку». На пачатку хлопцы выканалі свой новы рэпертуар, а потым пачаставалі ўсіх вясельнымі варыянтамі савецкіх і замежных шлягераў.

Першы дзень фестывалю скончыўся а другой гадзіне ночы.

Другі дзень, а дакладней вечар, можна назваць «парадам монстраў». Распачынаў канцэрт Алесь Камоцкі — чалавек, які стаяў разам з Сяржуком Сокалавым-Воюшам ля вытокаў сучаснай беларускай бардаўскай песні. Калі ў вас будзе патрэба паслухаць мудрыя, сумленныя, шчырыя, вясёлыя песні, ідзіце на канцэрты Алеся. Вы ніколі не падманеце сябе. Яго «Гаспадыня ранішняй зоркі» заваражыла слухачоў, і яны доўга не адпускалі Алеся пасля яго выступлення. Дарэчы, калі ўсё будзе добра, гэтай восенню ў гародненцаў з'явіцца магчымасць патрапіць на канцэрты Алеся Камоцкага, які даў згоду наведаць наш горад. Не прамініце скарыстаць гэты шанц.

Эля Бэзюк з Варшавы паказала, што і ў Польшчы ёсць вельмі самабытныя і таленавітыя беларускамоўныя выканаўцы. А Уладзімір Кандрыкінскі хацеў здзівіць усіх унікальным беларускім кантры. Але каманда яго не сабралася, і прыйшлося аднаму выконваць свае песні. І хоць песен было не шмат, але Уладзь паказаў, што значыць на высокім прафесійным узроўні рабіць любімую справу. Аб гурце «Новае неба» ўжо пісалі рэспубліканскія газеты і часопісы. Кася Камоцкая запрасіла слухачоў у свой паўакустычны свет гукаў і словаў. Пасля выступлення «Мясцовага часу» на сцэне — «Мроя». Новыя і ўжо вядомыя песні з альбому «Дваццаць восьмая зорка» падхапілі ўсе. Завадны стодрок каманды і вострасацыяльныя (як сцвярджаюць некаторыя крытыкі) тэксты — гэта твар «Мроі». Выступленне падалося даволі зацягнутым, але арганізатары імпрэзы былі ўпэўнены ў беспройгрышным варыянце такой сітуацыі.

Не паспелі правесці «Мрою», як перад публікай з'явіўся новы гурт з Менску «Рокіс». Пераможцы III туру хіт-парада «Беларускай маладзёжнай» былі названыя адкрыццём фестывалю. Іх выступленне сапраўды выклікала фурор. Задавальненне атрымалі ўсе: і музыкі, і тыя, для каго яны выступалі. Праўда, вартаўнікам парадку прыйшлося актывізаваць свае дзеянні па захаванню хаця б падабенства спакою каля сцэны. Скажу яшчэ, што ў «Рокісе» будзе выступаць экс-вакаліст «Бонды» Ігар Варашкевіч. Што ж, саюз абяцае быць цікавым, і першыя спробы прынеслі ўжо нядрэнныя вынікі. Гэтай восенню «Рокіс» таксама з'явіцца ў Гародні, і аматары сучаснага прафесійнага рока будуць мець магчымасць усё ўбачыць сваімі вачыма і пачуць сваімі вушамі.

Пайшоў дождж, і таму не ўсе ўдзельнікі паспелі выступіць. Але гэта не бяда. Свята адбылося. У адной з песен «Альбаросікі» ёсць такія словы:

Чаму ж нам не пець,
Калі ў сэрцы есць агонь?

Гэты агонь аб'яднаў некалькі тысяч людзей, якія ліпеньскімі начамі гэтага года падаравалі сабе магчымасць незабыўных пачуццяў. Я адкрыў для сябе дзіўны, прыгожы, не пакідаючы мяне да гэтай пары феномен — сучасную беларускую бардаўскую і рок-культуру. Вядомую далёка не ўсім, але якая заслугоўвае таго, каб аб ёй ведалі многія. Шкада вось, што ў нас, на Беларусі, няма пакуль што свайго «Басовішча».

На наступны фестываль «Басовішча-92» чакаюць прыезду Шынейд О'Конар і гурта «Ю-Ту», якія далі згоду на ўдзел.

**С. ЛАЎНІК.**

# НАША ГАЗЕТА




# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ


# ВАША ГАЗЕТА

## гэта сусвет

*шматпланавай ІНФАРМАЦЫІ*
*у час любой сацыяльна-эканамічнай фармацыі,*
*думкі ЦІКАВЫХ ЛЮДЗЕЙ,*
*калейдаскоп НЕЗВЫЧАЙНЫХ ІДЭЙ*
*НАВІНЫ з усіх універсітэтаў,*
*творы сучасных ПРАЗАІКАЎ І ПАЭТАЎ,*
у нашай газеце выступаюць
*ВЫКЛАДЧЫКІ,*
*КАНДЫДАТЫ,*
*ДАЦЭНТЫ,*
*ПРАФЕСАРЫ,*
*ЗАГАДЧЫКІ ўсіх кафедр і лабараторый.*
Толькі ў нас
*УНІКАЛЬНЫ ЛЕКТОРЫЙ*
*«Беларуская музыка сёння і ўчора»,*
*а таксама МОРА*
*ГУМАРУ, САТЫРЫ І СТУДЭНЦКІХ ЖАРТАЎ,*
*з якімі, мы думаем, пазнаёміцца варта,*
*спісы КНІГ, ПАТРЭБНЫХ І НОВЫХ,*
*ад якіх закружацца вашы галовы,*
*магчымасць выказаць СВАЕ МЕРКАВАННІ,*
*атрымаць АДКАЗЫ НА ЛЮБЫЯ ПЫТАННІ,*
*і, канечне ж,*
*ЗНАЕМСТВЫ І ВІНШАВАННІ,*
*не абыдзем ЖЫЦЦЁ СТУДЭНТАЎ,*
*не забудземся на ПАТЭНЦЫЯЛЬНЫХ АБІТУРЫЕНТАЎ.*
*Рэдакцыя плануе праводзіць канцэрты*
*ЛЕПШЫХ БАРДАЎ І ЛЕПШЫХ ГУРТОЎ,*
*выставы*
*БЕЛАРУСКІХ (І НЕ ТОЛЬКІ) МАСТАКОЎ,*
*ПРЫМАЕМ ЛЮБЫЯ КАШТОЎНЫЯ ПАРАДЫ,*
*якім, безумоўна, будзем вельмі рады.*
*Запрашаем усіх, хто мае час:*
*ЗАХОДЗЬЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, У ГОСЦІ ДА НАС.*
МЫ СПАДЗЯЁМСЯ НА ВАШУ ПАДТРЫМКУ.
Калі хочаце ўбачыць сябе на фотаздымку,
сваіх знаёмых, сваіх сяброў,
прачытаць аб сабе колькі добрых слоў,
**НЕ ПАШКАДУЙЦЕ НЕЙКІХ НЯШЧАСНЫХ ТРОХ (3) РУБЛЕЎ.**

НАШ АДРАС:
230023.
г. Гродна
вул. Ажэшкі, 22,
4 паверх, пакой 404







СЯБРЫ!
35 нашых нумароў
разбудзяць ваш розум,
зрушаць у венах кроў,
прынясуць хвіліны задавальнення,
унясуць у жыццё поўнае ажыўленне.
СТВАРАЙЦЕ ГРУПЫ ПАДТРЫМКІ,
ПАДПІСВАЙЦЕСЯ НА ГАЗЕТУ
«ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ»
І ВЫ ЎБАЧЫЦЕ, ЯК ЗМЕНІЦЦА
НАВАКОЛЬНЫ СВЕТ!
З 1 верасня пачынаецца падпіска на нашу газету.
КОШТ — 3 рублі.


| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Наш адрас: 230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 404, тэл. 44-72-97 | Газета выходзіць штодыднёва Аб 'ём газеты — адзін друкаваны аркуш | Газета надрукавана афсетным спосабам у Гродзенскай абласной узбуйненай друкарні г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4 Падпісана ў друк у 16.00. наклад: 2000 Зак. 5737 | ЗАСНАВАЛЬНІКІ: САВЕТ УНІВЕРСІТЭТА, ПРАФКАМ СУПРАЦОЎНІКАЎ, ПРАФКАМ СТУДЭНТАЎ, КАМІТЭТ КАМСАМОЛА. | РЭДАКТАР С. М. ЛАЎНІК |